в области психологии, педагогики, физиологии. Таким образом можно заключить, что в организации воспитательной работы в современном вузе, как и при осуществлении образовательного процесса в целом, личностно-ориентированный подход может найти свое применение. Основное же внимание следует уделить информированности самих студентов, поскольку большая часть работы зависит от них самих. От личной заинтересованности в собственном развитии: интеллектуальном, этическом, психологическом, духовном становлении в целом. Без такой заинтересованности и без изучения потребности в таком развитии (на уровне хотя бы тестирования или собеседования при поступлении в вузы наряду с экзаменами) дальнейшее развитие сферы образования в РБ представляется проблематичным.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Латыш Н.И. Концепция воспитания учащейся молодежи в Республике Беларусь. – Министерство образования РБ, НИО. – Минск, 1998. – 47 с.
2. Шикун А.И. Конспект лекций по социологии. Часть1. Учебное пособие. – Брест, 1993. – 36 с.
3. Шумская Л.И., Завадская Ж.Е. Основы воспитательной работы с учащейся молодежью. Учебное пособие. – Минск: Універсітэцкае, 2000. – 190 с.
4. Шумская Л.И., Карпенко И.В., Денисов В.А. Организация системы воспитательной работы со студенческой молодежью. Пособие. – Минск: БГПУ им. М. Танка, 2000. – 100 с.


УДК 75 (476)

***Папко В.М.***

# МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА Ў КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991-2000)

Музычнае жыццё сучаснай Беларусі ўяўляе сабой на дзіва стракатую палітру, дзе пераплятаюцца розныя плыні, накірункі, стылі і імпрэзы. У 90-я гг. назіраюцца некаторыя новыя тэндэнцыі развіцця музычнага мастацтва, якія характэрны беларускай культуры ў цэлым. У першую чаргу неабходна назваць стварэнне новых музычных арганізыцый і творчых калектываў, з'яўленне новых музычных фестываляў, цікавыя пастаноўкі ў тэатрах.

У 1991 – 2000 гг. у Рэспубліцы Беларусь існавала два творчых аб'яднання прафесіяналаў у сферы музычнага мастацтва: Саюз кампазітараў і Саюз музычных дзеячаў Беларусі. Гэтыя арганізацыі перажылі перыяд ломкі старой структыры, змяніўся характар іх адносін з міністэрствам культуры. Паміж з'ездамі Саюза кампазітараў 1989 г. і 1994 г. у саюз было прынята 24 новых члена – кампазітара і музыказнаўца. [3] У публікацыях, прысвечаных з'ездам Саюза кампазітараў яскрава прасочваецца занепакоенасць кампазітараў станам прапаганды беларускай музыкі ў краіне. 15 – 22 студзеня 1998 г. адбыўся XII з'езд Саюза кампазітараў Беларусі. За гады пасля XI з'езда колькасны склад саюза амаль не змяніўся, пайшлі з жыцця 5 яго членаў, былі прыняты 6 новых кампазітараў. У складзе яго на 1998 г. было 111 чалавек, 9 з якіх жылі за межамі Беларусі. У 90-я гг. у складзе Саюза кампазітараў з'явілася Асацыяцыя сучаснай музыкі, у 1993 г. гэтая арганізацыя стала называцца Таварыствам сучаснай музыкі, з прычыны ўваходжання ў якасці Беларускай секцыі ў міжнароднае Таварыства сучаснай музыкі са штаб-кватэрай у Амстэрдаме.[5]

У 90-я гг. замацаваў свае пазіцыі створаны ў 1991 г. Саюз музычных дзеячоў Беларусі, які пачаў стала падтрымліваць правядзенне многіх музычных фестываляў у Мінску, "Снежанськія музычныя вечары" ў Брэсце, фестывалі "Убельская ластаўка" ў Чэрвені, імя І. Салярцінскага ў Віцебску і інш. [15] Гэты перыяд для Саюза музычных дзеячоў стаў часам фарміравання асноўных яго прынцыпаў дзейнасці і мясцовах падраздзяленняў арганізацыі.

Развіццю беларускага музычнага мастацтва садзейнічала стварэнне новых твораў буйной формы, значна ўзрасла папулярнасць сімфанічных жанраў. У пер. пал. 90-х гг. былі напісаны 8-я сімфонія Д. Смольскага з вершамі І. Бродскага, камерная сімфонія для сапрана, барытона і камернага ансамбля "Апошняя восень паэта" В. Войціка на вершы П. Верлена ў перакладзе М. Багдановіча, 2-я сімфонія У. Дамарацкага, сімфонія "Гравюры" С. Бельцюкова для хору і аркестра, сімфонія "Плач перапёлкі" для хору і аркестра У. Кандрусевіча, 4-я сімфонія А. Соніна "Музыка для Мандэльштама" для фартэпіяна сола. У гэты перыяд Міністэрства культуры абвясціла конкурс на стварэнне лепшага твора да юбілею Ф. Скарыны, які пацягнуў за сабой напісанне 3-й сімфоніі У. Дарохіна "Францыск Скарына: жыццё і бессмяротнасць", сімфоніі "Lux aeterna" ("Вечнае святло") Я. Паплаўскага, містэрыі "Францыск" для баса і аркестра А. Літвіноўскага і інш. Зразумела, што кампазітараў хвалююць тыя ж самыя тэмы, што і пісьменнікаў, мастакоў, дзеячоў тэатральнага мастацтва – асэнсаванне сталінскіх рэпрэсій (8-я сімфонія "Памяці ахвяраў сталінізму" Ф. Пыталева, 4-я сімфонія "Курапаты" К. Цесакова), чарнобальская трагедыя (10-я сімфонія "Чорная быль" Ф. Пыталева, "Цэзій-137" В. Кузняцова), перапрацоўка авангардысцкіх уплываў ("Супрэматызм" Н. Голубевай) і інш. Сярод вакальна-сімфанічных твораў к. 80-х – пер. пал. 90-х гг. хацелася б адзначыць кантаты "Куранты" В. Капыцькі, "Тысяча гадоў надзеі" і "У гонар сусветнага пажару" Г. Гарэлавай (апошні з твораў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй РБ). [3]

У 1991 г. на Беларусі працавала два музычных тэатры, але тэатр оперы і балета знаходзіўся ў стане распаду на дзве трупы. Загадам Міністэрства культуры РБ № 105 ад 29 кастрычніка 1992 г. балетнай трупе ДАВТа Рэспублікі Беларусь была прадстаўлена эканамічная і творчая самастойнасць. Мастацкім кіраўніком новага калектыва, які атрымаў назву Акадэмічны Вялікі тэатр балета РБ быў прызначаны В.М.Елізар'еў. Мастацкі кіраўнік атрымаў шырокія правы – згодна загаду ён мог самастойна выраішаць усе кадравыя і фінансавыя пытанні, размяркоўваць сродкі Балета ДАВТа, падпісываць усе пагадненні, дагаворы, устанаўліваць міжнародныя кантакты і арганізоўваць гастролі. [1]

Першапачаткова пасля падзела было створана "Творчае аб'яднанне Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь", у склад якога ўваходзілі два калектыва, якія мелі поўную аўтаномію. Мастацкім кіраўніком тэатра оперы стаў былы дырэктар тэатра оперы і балета, кампазітар С.Картэс. Раздзяленне тэатра адбылося па ініцыятыве балетнай яго часткі. Прычына такой ініцыятывы – на той час опера стала

***Попко Ольга Николаевна**, ассистент каф. философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

цяжарам для балетнай трупы, якая атрымала значную папулярнасць, шмат гастралявала ў свеце і была вымушана матэрыяльна падтрымліваць оперную трупу. Неабходна прызнаць, што гэтая акцыя прынясла стоноўчыя вынікі, стымулявала самастойнае развіццё тэатра оперы, які да канца 90-х гг. таксама дасягнуў некаторых поспехаў, пачаў больш гастраляваць у Еўропе, запрашаць на сваю сцэну замежных артыстаў. У пер. пал. 90-х гг. тэатр оперы перажываў значны крызіс, адным з паказчыкаў якога і было аддзяленне балетнай трупы. Спектаклі ў гэты час праходзілі пры пустых залах – запаўняльнасць іх у 1995 г. складала толькі 14 %. Але гэтая сітуацыя пачала выпраўляцца – у 1996 г. запаўняльнасць залы ўзрасла да 37 %, у 1997 г. – 45 %, у 1998 – 72 %, у 1999 г. – 95 %. [14] На сучасны момант тэатр оперы адзін з самых папулярных на Беларусі. Раздзяленне павялічыла даходы абодвух тэатраў: напрыклад, ў 1998 г. на спектаклі ў будынак былога ДАВТа прыйшло на 42, 1 тыс. гледачоў больш, чым у 1997 г., а калі гэтыя паказчыкі параўноўваць з 1996 г., то атрымаецца на 54, 1 тыс. чалавек больш. [9]

У 90-я гг. працягваўся працэс стварэння і пастаноўкі оперных твораў сучасных беларускіх кампазітараў. Усе яны атрымалі свае ўвасабленне на сцэне ў пачатку 90-х гг., калі былі пастаўлены творы Я.Глебава "Майстар і Маргарыта" (1992), А.Бандарэнкі "Князь Наваградскі" (1992), С.Картэса "Візіт дамы" (1995). Прэм'ера оперы Я. Глебава "Майстар і Маргарыта" (1990) (лібрэта Л.Глебавай і Я. Глебава па аднаіменным рамане М. Булгакава) адбылася ў сакавіку 1992 г. (музычны кіраўнік А. Анісімаў, мастак У. Арэф'еў).

Опера "Князь Наваградскі" была напісана кампазітарам А.Бандарэнкай у 1991 г. на лібрэта В. Іпатавай па п'есе Л. Пракопчыка, створанай па дзяржаўным заказе з боку Міністэрства культуры. На падставе гэтай п'есы гродзенскі кампазітар А.Бандарэнка стварыў оперу, сюжэт якой абапіраецца на рэальныя падзеі, звязаныя са стварэннем ВКЛ, распаўсюджаннем хрысціянства на беларускіх і літоўскіх землях. Прэм'ера оперы адбылася у снежні 1992 г., а яе пастаноўшчыкамі сталі рэжысёр С.Штэйн, мастак Д.Мохаў, музычны кіраўнік М.Калядка. [12]

Негледзячы на некаторыя недахопы оперы, "Князь Наваградскі" – адлюстраванне новай тэндэнцыі ў сучаснай музыцы – пранікненне нацыянальнай тэматыкі і гістарычных вобразаў не толькі ў творы малой, але і вялікай музычнадраматургічнай формы, працэс фарміравання нацыянальнай опернай і балетнай музычнай школы. У 1994 г. А.Бандарэнка быў удастоены Дзяржаўнай прэміі РБ за гэты твор. [12, 429] Але пазней опера "Князь Наваградскі" была знята з пракату.

У 90-я гг. у беларускім оперным тэатры з'явілася яшчэ адна традыцыя, якая існуе ва ўсім свеце – пастаноўка опер на мове арыгінала, сярод якіх былі пастаноўкі "Тоскі" Дж. Пуччыні на італьянскай мове (1995), "Лючыі ды Ламермур" Г. Даніцэці на італьянскай мове (1999) і некаторыя інш. З прычыны таго, што пастаноўка оперных спектакляў патрабуе ўкладання вялікіх сродкаў (значна даражэй за іншыя тэатральныя пастаноўкі) оперны тэатр актывізаваў пастаноўку твораў у канцэртна-сцэнічным выкананні. Сярод такіх пастановак былі оперы "Моцарт і Сальеры" М. Рымскава-Корсакава (1991), "Барыс Гадуноў" М.Мусаргскага (1998), "Паяцы" Р.Леанкавала (1998), "Набука" Дж. Вердзі (1999), "Фауст" А.Радзівіла (1999). [22, 342-343] Неабходна прызнаць, што выкананне оперы ў канцэртным варыянце (калі адсутнічаюць дэкарацыі, абмежавана драматычнае дзейства) значна прайграе традыцыйнаму. Аднак такі варыянт падрыхтоўкі спектакляў дазваляе хутчэй узбагачаць рэпертуар (оперныя пастаноўкі звычайна рыхтуюцца па некалькі гадоў), лягчэй вывозіць спектаклі на міжнародныя фестывалі, у якіх з сяр. 90-х гг. усё актыўней пачаў удзельнічаць Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы. Адна з верагодных прычын таго, што беларускі нацыянальны рэпертуар павольна пранікае ў оперу – большая запатрабаванасць класічных твораў на замежных гастролях, якія тэатр оперы пачаў больш актыўна праводзіць пасля раздзядення ДАВТа.

Акрамя балета "Страсці" у рэпертуары Нацыянальнага тэатра балета існуюць толькі два невялікія спектаклі на музыку беларускіх кампазітараў – аднаактовыя балеты "Кругаверць" Л.Залётава (1996) і "Макбэт" В. Кузняцова (2000).

Трэці музычны тэатр Беларусі – Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі ў 90-я гг. ажыццявіў пастаноўку толькі двух твораў беларускіх кампазітараў – мюзіклаў У.Кандрусевіча "Джулія" (1991) і "Шклянка вады" (1994), заставаліся ў рэпертуары музычная камедыя Я. Глебава "Міліянерка", а да 1994 г. на працягу 15 сезонаў ішла народная камедыя Р. Суруса "Несцерка". Ні адзін з новых спектакляў не грунтуецца на нацыянальным матэрыяле. Творы беларускіх кампазітараў увогуле на сцэне тэатра ставяцца вельмі рэдка і за рэдкім выключэннем, існуюць ўсяго па некалькі сезонаў. Так і не былі пастаўлены творы "Месячны дзень" У. Дамарацкага, "Драўляны рыцар" С. Бельцюкова, "Мілавіца" У. Солтана. Большасць рэпертуару гэтага тэатра ў 90-я гг. складалі класічныя і савецкія аперэты. Мюзікл У. Кандрусевіча "Джулія" быў пастаўлены ў музычным тэатры ў сезоне 1991/1992 г., пасля таго як праляжаў каля дзесяці гадоў на паліцы. Гэты твор быў напісаны спецыяльна пад акцёрскія і вакальныя здольнасці прымы тэатра Наталлі Гайды.

Некаторы час на базе Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі існаваў самастойны калектыў – дзіцячы музычны тэатр "Казка", створаны ў 1991 г. Гэты калектыў падрыхтаваў некалькі твораў – "Гісторыя Кая і Герды" С. Баневіча, "Дзіцячы альбом" П. Чайкоўскага, опера "Вясновая песня" і мюзікл "Прыгоды ў замку Алфавіт" беларускага кампазітара В. Войціка. Калі закрыўся тэатр? [22, 344-346]

Каля года ішоў на сцэне тэатра музкамедыі дзіцячы спектакль "Калі заспявае певень" (музыка А. Чыркуна, лібрэта Г. Марчука), створаны па дзяржаўным заказе на нацыянальным матэрыяле. Аднак крытыкамі гэтаму спектаклю прызначылі вельмі нізкі мастацкі ўзровень і кіраўніцтва тэатра зняло яго з пракату. [10, 34] Неабходна прызнаць, што за гэты перыяд значна падняўся ўзровень прафесіяналізму балетнай трупы тэатра, на базе якой у 1992 г. узнік самастойны харэаграфічны калектыў "Мінск-балет", які ажыццявіў пастаноўку аднаактовых балетаў "Штраўсіяна", "Іспанскі Дывертысмент", "Шэхерэзада" М. Рымскава-Корсакава і некаторых іншых. [11, 432]

Сярод музычных тэатраў у самым лепшым фінансавым становішчы знаходзіцца Нацыянальны акадэмічны тэатр балета. Акрамя таго, што ён самы запатрабаваны на захадзе і вядзе самую актыўную на сённяшні дзень гастрольную дзейнасць, з 1999 г. яго трупа карыстаецца асобнай фінансавай падтрымкай дзяржавы. Гэтая падтрымка выразілася ў прыняцці Палажэння аб устанаўленні свабодных цэн на 75 % квіткоў на спектаклі балета, а на астатнія 25 % цэны устанаўлівае Міністэрства культуры. Ёсць у тэатра балета і магчымасць дыферэнцыраваць памеры сутачных падчас гастроляў за мяжой. [13] Наогул, музычныя тэатры ў 90-я гг. трымаюць планку самых папулярных у гледача: у 1998 г. самы высокі паказчык сярэдняй запаўняльнасці глядзельнай залы быў у тэатра балета (97 %), тэатра музкамедыі (92 %) і Маладзёжнага тэатра (90 %). [9]

У гэты перыяд значна вырасла колькасць прафесійных музычных калектываў – ад 17 калектываў у 1985 да 25 у 1993 г. Самым актыўным сярод іх з'яўляецца створаны ў 1987 г. Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, які ўзначальвае М. Фінберг. Гэты творчы калектыў вельмі актыўна папулярызуе беларускае старадаўняе і сучаснае мастацтва, сам з'яўляецца ініцыятарам, арганізатарам і актыўным удзельнікам многіх музычных фестываляў і імпрэз. Менавіта ў выкананні гэтага калектыву ўпершыню гучыць большасць новых твораў беларускпім кампазітараў. Другі напрамак творчасці гэтага арке-

стра – выкананне джазавай музыкі. Кіраўнік гэтага калектыва Міхаіл Фінберг у 1994 г. атрымаў званне народнага артыста Беларусі. [11, 433] У структуру Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі ўваходзяць Біг-бэнд, ансамбль трубачоў "Інтрада", Камерны аркестр, Актэт драўляных духавых інструментаў. У 90-я гг. аркестр быў арганізатарам некалькіх уласных фестываляў, сярод якіх "Маладзечна", "Музы Нясвіжа" і джазавы. [4] Творчае крэда аркестра, на думку яго кіраўніка, М. Фінберга – "нацыянальная аснова нашай творчай дзейнасці, праца над нацыянальным музычным матэрыялам. Мы заўсёды адштурхоўваліся ад беларускай нацыянальнай паэзіі, прычым пераважна класічнай…" Другі накірунак дзейнасці аркестра – выкананне твораў беларускіх кампазітараў буйных формаў, як класікаў, так і сучасных кампазітараў.[6]

Працэс стварэння новых музычных калектываў ідзе па двух шляхах: непасрэднае ўтварэнне калектыва праз набор прафесійных музыкантаў, другі – наданне афіцыйнага прафесійнага статусу аматарскаму калектыву, які мае высокія творчыя дасягненні. Прыкладам другога варыянта стварэння калектыва можа служыць Камерны канцэртны аркестр народных інструментаў Рэспублікі Беларусь, указ аб стварэнні якога быў падпісаны міністрам культуры ў канцы 1997 г. Гэты калектыў пад назвай "Менск" з'явіўся на пачатку 90-х гг. на базе самадзейнага аркестра народных інструментаў Беларускай політэхнічнай акадэміі, куды ўліліся прафесійныя музыканты. Паступова калектыў набыў папулярнасць, шмат гастраляваў. 7 мая 1998 г. канцэртам у зале Белдзяржфілармоніі адбылася прэзентацыя калектыва ўжо ў новым статусе. Неабходна адзначыць, што па сваёй структуры аркестр не з'ўляецца тыповым: асновай яго з'яўляюцца народныя струнныя інструменты – домбры і балалайкі, з групай духавых інструментаў сімфанічнага аркестра. Такая пабудова дазваляе калектыву выконваць як класічны сімфанічны рэпертуар, так і творы народнай музыкі і іх апрацоўкі. Каля пяці гадоў гэты калектыў падтрымліваў кіраўнік "Мінскпрамбанка" Я. Краўцоў, які не толькі плаціў зарплату музыкантам, але і падарыў ім сцэнічныя касцюмы. Дзякуючы гэтай падтрымцы калектыў змог выстаяць у складаных эканамічных умовах.[18]

На пачатак 2001 г. у сістэме міністэрства культуры РБ знаходзілася 77 пастаянных прафесійных калектываў. Самую вялікую колькасць з іх утрымлівалі: Дзяржаўнае аб'яднанне "Белканцэрт" (24 калектывы), Беларуская дзяржаўная філармонія (13), Магілёўская абласная філармонія (11). [17] Новыя творчыя інструментальныя калектывы ўзнікалі і напрыканцы 90-х гг. Напрыклад, у 1998 г. у Магілёўскай абласной філармоніі і Дзяржаўным аб'яднанні "Белканцэрт" з'явілася па два новых калектыва. [9] У пер. пал. 90-х гг. праходзіў працэс скарачэння колькасці канцэртаў і слухачоў на іх, што адбывалася па эканамічных прычынах. За перыяд з 1991 г. па 1995 г. больш чым у два разы скарацілася колькасць наведванняў тэатраў і канцэртных устаноў краіны.[8]

У 90-я гг. на Беларусі ўзнікла шмат новых фестываляў, адным з першых сярод іх быў фестываль „Адраджэнне беларускай капэлы", які існуе з кастрычніка 1991 г. Ён быў арганізаваны Саюзамі музычных і тэатральных дзеячаў і Белдзяржфілармоніяй, мастацкім кіраўніком гэтага мерапрыемства з'яўляецца В. Скорабагатаў. Асноўнай мэтай правядзення фестывалю з'яўляецца адраджэнне старажытных еўрапейскіх традыцый капэлы, пашыраных на тэрыторыі Беларусі ў XVII - - XVIII стст. На першым фестывалі прагучалі праваслаўныя распевы ў гонар Е. Полацкай, створаныя ў XII—XV стст., меса нясвіжскага капелана Шымкевіча, гімны ўсіх хрысціянскіх канфесій, якія існавалі на Беларусі XVIII – XX стст., старажытная свецкая музыка М. К. Агінскага, урыўкі з оперы "Агатка" І. Голанда, творы В. Цітова на вешы С. Полацкага і інш. [21] Часам развіццё творчага калектыву прыводзіць да таго, што на яго базе ствараюцца вялікія творчыя аб'яднанні. Прыкладам можа служыць стварэнне нацыянальнага тэатральна-канцэртнага аб'яднання "Беларуская капэла", якое адбылося ў 1992 г. на базе аднайменнага музычнага калектыву. Мэтай стварэння стала адраджэнне нацыянальнай старажытнай музычнай культуры, даследаванне і уключэнне ў культурнае жыццё музычнай спадчыны, прапаганда сучаснай музыкі беларускіх кампазітараў. Стваральнікі тэатральна-канцэртнага аб'яднання зыходзілі з думкі, што ў мінулым Беларусь была асяродкам еўрапейскай музычнай культуры і неабходна адрадзіць гэтыя традыцыі. Для ажыццяўлення гэтай мэты праводзіліся фестывалі. У кастрычніку 1991 г. асноўнай тэмай фестываля стала музыка эпохі барока і класіцызму, на другім, у лістападзе 1992 г. выконваліся галоўным чынам творы замежных аўтараў, творчасць якіх мела дачыненне да Беларусі. Дзейнасць "Беларускай капэлы" садзейнічала з'яўленню тэатральных і канцэртных твораў на музыку старажытных беларускіх кампазітараў: аднаактовы балет кампазітара В. Кузняцова па творах Агінскага (1995) і пастаноўка на сцэне опернага тэатра оперы "Фауст" А. Радзівіла (1999). [19]

На III-м фестывалі „Адраджэнне беларускай капэлы" галоўнай тэмай стала сучасная камерная музыка. Адным з асноўных прынцыпаў арганізацыі дзейнасці капэл XVII – XVIII стст. было выкананне сучаснай ім музыкі, часцей напісанай нават самімі кіраўнікамі гэтых капэл і мясцовымі кампазітарамі. У межах фестывалю былі праведзены аўтарскія канцэрты А. Калеві, прафесара Хельсінскай акадэміі музыкі, польскага кампазітара З. Краўзэ, прафесара Іерусалімскай акадэміі музыкі М. Капытмана. Ансамбль салістаў "Класік-Авангард" выканаў праграму новых твораў беларускіх і замежных кампазітараў.[7]

У студзені 1994 г. "Беларуская капэла" стала арганізатарам новай музычнай імпрэзы пад назвай "Каляды ў "Беларускай капэле", у рамках якой тры вечары запар гучала музыка кампазітараў беларускага замежжа: М. Куліковіча-Шчаглова, М. Равенскага, Рэ Самохіна, Э. Зубковіч, Я. Тарасевіча, Д. Верасава, І. Мацісўскага. Гэтыя кампазітары нават жывучы за мяжой, пісалі творы на вершы беларускіх паэтаў, прапагандавалі беларускі фальклор, вывучалі яго. [16]

Адным з адкрыццёў IV фестываля "Адраджэнне беларускай капэлы" былі фартэпіянныя творы Напалеона Орды, якія выконваў на сваім канцэрце І. Алоўнікаў. У іншых канцэртах Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр выконваў творы Міхаіла Ельскага, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы разам з тым жа аркестрам – музыку В. Казлоўскага да трагедыі Озерава "Фінгал". Спонсарам IV фестываля выступіла культурна-асветніцкае таварыства "Ліцвіны". [20]

У юбілейным XI фестывалі прынялі ўдзел такія калектывы, як ансамбль салістаў „Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам У. Байдаева, камерны мужчынскі хор „Унія", камерны хор Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі пад кіраўніцтвам К. Насаева, ансамбль старадаўняй музыкі „Кантабіле". Гэтыя калектывы выконваюць на сваіх канцэртах творы XIV—XX стст.: з "Полацкага сшытка", "Віленскага сшытка", С. Манюшкі, М. Каз. Агінскага, М. Радзівіла, В. Казлоўскага, Я. Голанда, М.К. Чурлёніса, Н. Орды і многіх іншых кампазітараў, якія паходзілі ці жылі на Беларусі.[2] Большасць з іх у савецкія часы былі невядомыя на Белоарусі і ў 90-я гг. зноў былі ўключаны ў культурны зварот, іх творы пачалі выконвацца, гучаць, сталі вядомы беларускім музыкантам і слухачам. За перыяд свайго існавання Нацыянальнае тэатральна-канцэртнае аб'яднанне "Беларуская капэла" актыўна паўплывала на абагачэнне рэпертуару многіх прафесійных мізычных калектываў творамі старажытнай і сучаснай беларускай музыкі, праводзіць сваю палітыку актывізацыі культурнага жыцця краіны ў нацыянальным русле, прыдала адметнасці творчасці многіх калектываў, садзейнічала папулярызацыі беларускай камернай і

сімфанічнай музыкі ў слухача. Другі аспект дзейнасці капэлы – выдавецтва нот, даследаванні ў галіне гісторыі музыкі, адраджэння старажытнай музычнай спадчыны.

Адраджэнне цікавасці да старажытнай беларускай музыкі можна лічыць адной з асаблівасцей беларускай культуры на сучасным этапе. Гэтаму садзейнічаюць іншыя музычныя фестывалі, такія як "Маладзечна", "Магутны Божа" ў Магілёве. "Музы Нясвіжа" і г.д. Старажытная музыка стала крыніцай натхнення сучасных кампазітараў і выканаўцаў, яна ўсё часцей гучыць на канцэртах. Утварэнне і дзейнасць новых музычных ансамбляў і аркестраў садзейнічае ўзбагачэнню музычнага жыцця краіны, спрыяе го разнастайнасці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ:


1. Архіў Міністэрства культуры РБ, воп.1, ф. 974, спр. 2071, л. 233-234.
2. Берасцень С. Адраджэнне – праз музыку// Лім, 2001, 19 кастрычніка, с. 2.
3. Берасцень С. Без альтэрнатывы. Без апазіцыі. Але – з надзеяй. З XI з'езда кампазітараў Беларусі// Лім, 1994, 4 лютага, с. 10-11.
4. Берасцень С. Бліц-турнэ па музычных сталіцах, або Вялікая справа "маленькай філармоніі"// Лім, 1999, 11 чэрвеня, с. 10-11.
5. Берасцень С. Каб над выспай – ды дзяржаўны "парасон"// Лім, 1998, 16 студзеня, с.3-4.
6. Бунцэвіч Н. Акцэнты і штрыхі – святкуем разам!// Культура, 8 – 14 снежня, с. 1, 4.
7. Загородний Г. Вчера написанное – сегодня исполняется// Белорусская нива, 1993, 24 ноября, с. 3
8. Культурнае жыццё рэспублікі. Стан, праблемы, тэндэнцыі. Статыстычны агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 1996 год. Мн., Бел ІПК, 1997, с.9.
9. Культурнае жыццё Рэспублікі. Стан, праблемы, тэндэнцыі. Статыстычны агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 1998 год. Мн., Бел ІПК, 1999, с.93.
10. Лысенка З. Пашыраючы рамкі жанру// Тэатральная Беларусь, 1994, № 3, с. 31-36.
11. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
12. Мазура В.Я. Нацыянальныя спектаклі на сцэнс Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь//Аператыўная інфармацыя па праблсмах культуры і мастацтва, 1994, вып. 4, с.36-54.
13. Мазура В.Я. Стан, праблемы і новыя напрамкі творчай дзейнасці Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Рэспублікі Беларусь (Па матэрыялах рэспубліканскага друку за 1997-2000 гг.)// Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: навукова–інфармацыйны зб. 2000, вып. 6, с.12-26.
14. Мазура В.Я. Стан, праблемы і новыя напрамкі творчай дзейнасці Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь (Па матэрыялах рэспубліканскага друку за 1995-2000 гг.)// Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: навукова–інфармацыйны зб. 2000, вып.3, с.31-43.
15. Праз год – з'езд//Лім, 2000, 15 снежня, с. 2.
16. Рамянюк М. Каляды ў "Беларускай капэле"// Голас Радзімы, 1994, 27 студзеня, с.1, 6.
17. Статыстычны агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (01.01.2001) Мн., 2002, с.17.
18. Таірава Л. З нараджэннем цябе, новы калектыў!// Мастацтва, 1998, № 12, с. 14-15.
19. Тэатральная Беларусь, т. 1, Мн., 2002, с. 109-110.
20. Чертович Б. Нашествие Наполеона Орды// Знамя юности, 1994, 17 ноября, с.3.
21. Шчарбакова Т. На пачатку шляху// Мастацтва, 1992, № 3, с. 5-9.
22. Юўчанка Н.А. Музычнае мастацтва// Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000, с.338-349.


УДК 18+7.01

***Чистякова Т.Л., Ширяева Л.А., Чистякова Г.Г.***

# В ПОИСКАХ СТИЛЯ ОТ ВЕНТУРИ ДО КУРОКАВЫ

Концепции порядка «новых времен» всегда появлялись в истории развития архитектурных стилей, начиная с античной классики и кончая постмодернизмом. В рамках одного стиля закономерно вставал вопрос о качестве, синтезе, образности, конструктивности. Всякое творение архитектуры требует глубокого размышления и имеет при рождении огромное количество точек соприкосновения с объективными мирами отдельных индивидуумов. Понятие стиля встает в творческой работе архитекторов, которые работают своими методами, решая определенные конструктивно-художественные задачи. Если им удается одновременно выполнить несколько задач, найти неповторимый облик архитектурного произведения, то, в таком случае, целому поколению молодых дается возможность иметь образец, уникальный пример для обучения. Так было со знаменитыми греческими постройками в Олимпе, собором св. Петра в Риме, оригинальными работами Бернини. Можно сказать, что сегодня выбор стиля в работе архитектора не является доминирующим. Исходя из условий постмодернистской концепции творчества – вариантность, компиляция, цитирование, отверженность, насмешки над старым – являются нормальными в способах работы. Разнообразие форм, самобытность, репрезентативность, богатство материалов ставят право свободы выше требований универсализма. Ведущий американский архитектор-постмодернист Роберт Вентури в своей статье «Многообразие, соответствие культурному контексту и репрезентативность в историзме» пишет о том, что в каждый период времени классики модернизма имели постоянный набор приемов, который применяли к различным типам зданий. Он рассматривает взаимодействие общего стиля эпохи с личным подчерком таких архитекторов, как Ле Корбюзье и Мис ван дер Роэ. «Для этих мастеров варианты стиля внутри их собственной ауры означали бы колебание и недостаток обязательства по отношению к единому идеалу, все же работы каждого из них в целом имели тенден-

***Чистякова Татьяна Леонидовна****, доцент каф. философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*

***Ширяева Лариса Алексеевна****, ст. преподаватель каф. философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*

***Чистякова Галина Геннадьевна,*** *Брестский государственный технический университет.*

*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*